

# КРЫНІЧКА

**Дзяржаўная ўстанова адукацыі**
**“Чэрнікаўшчынскі вучэбна-педагагічны комплекс**
**дзіцячы сад – базавая школа”**

Выпуск №3 (28)
Лістапад 2022

## У нумары:

| | |
|---|---|
| **Стань прыкметным у цемры!!!** | **Стар. 1** |
| **Квэст-гульня “Мой родны край”** | **Стар. 2** |
| **Энергазберажэнне – справа кожнага!** | **Стар. 3** |
| **Дзейнасць школьнага атрада ЮІД** | **Стар. 4** |
| **Экскурсія з Цэнтр бяспекі МНС** | **Стар. 5** |
| **Шосты школьны дзень** | **Стар. 6** |

# Стань прыкметным у цемры!!!

**Флікер** робіць удзельнікаў дарожнага руху на цёмнай дарозе прыкметнымі ў святле фар на адлегласці да 400 метраў. А гэта дае вадзіцелю дадатковы час на прыняцце найбольш правільнага рашэння, каб прадухіліць ДТЗ.

Таму Дзяржаўтаінспекцыя яшчэ раз нагадвае аб **неабходнасці выкарыстання** гэтых карысных прыстасаванняў пры ўдзеле ў дарожным руху, бо менавіта гэты элемент бяспекі **можа зберагчы пешахода ад небяспечных сітуацый на дарозе.**



# Квэст-гульня “Мой родны край”



У рамках Года гістарычнай памяці ў школьнай бібліятэцы з 1 па 5 лістапада была арганізавана **выстава “Якуб Колас. Старонкі жыцця і творчасці. Да 140-годдзя з дня нараджэння».**

Празаік і паэт, драматург і публіцыст Якуб Колас па праву лічыцца класікам беларускай літаратуры.

На юбілейнай выставе, прысвечанай 140-годдзю з дня нараджэння Якуба Коласа, былі прадстаўлены зборы твораў пісьменніка, асобна выдадзеныя творы, матэрыялы пра яго жыццё і творчасць.

3 лістапада, у Дзень нараджэння Якуба Коласа, у школьнай бібліятэцы прайшла **квэст-гульня "Мой родны край"**.

Мэта дадзенага мерапрыемства - фарміраванне ў вучняў гістарычных каштоўнасцей, павагі да мінулага і сучаснасці сваёй Радзімы, прывіццё любові і беражлівых адносін да прыроды.

У ходзе мерапрыемства вучні пазнаёміліся з творчасцю Якуба Коласа, паслухалі і абмеркавалі вершы і песні на вершы аўтара; паўдзельнічалі ў спартыўна-турыстычных спаборніцтвах (бег у мяшках); выконвалі заданні "вугалькі" і "бабкі-вожыкі"; адгадвалі турыстычныя і гістарычныя загадкі; з дапамогай карты-шыфроўкі шукалі скарб.













# Энергазберажэнне – справа кожнага!




11 лістапада ў свеце адзначаецца **Міжнародны дзень энергазберажэння.** Асноўная мэта свята - прыцягненне ўвагі грамадскасці да рацыянальнага выкарыстання энергарэсурсаў.

Міжнародны дзень энергазберажэння адзначаецца па ініцыятыве міжнароднай экалагічнай сеткі "Школьны праект па выкарыстанні рэсурсаў і энергіі" (SPARE). Такое рашэнне прынялі ў красавіку 2008 г. на міжнароднай нарадзе каардынатараў SPARE, якая праходзіла ў Казахстане. А ўжо ў лістападзе 2008 года свет адзначыў першы Дзень энергазберажэння. Рэспубліка Беларусь не стала выключэннем і з першых гадоў імпрэзы гэтага дня далучылася да мерапрыемства.

10 лістапада класная гадзіна ў 6 класе была прысвечана пытанням энергазберажэння. Вучні ўзгадалі пра Міжнародны Дзень энергазберажэння, азнаёміліся з правіламі эфектыўнага і эканомнага выкарыстання энергарэсурсаў, абмеркавалі асноўныя спосабы энергазберажэння.

Кожны з прысутных адлюстраваў на паперы, што мае на ўвазе пад сабой энергазберажэнне і рацыянальнае выкарыстанне энергарэсурсаў.

У выніку, усе прыйшлі да высновы, што энергазберажэнне - справа кожнага!





# Дзейнасць школьнага атрада ЮІД

14 лістапада 2022 года перад навучэнцамі першага класа выступіў атрад ЮІД з **інсцэніроўкай "Правілы дарожнага руху ў лесе"**.

Казачныя героі расказалі рабятам аб правілах дарожнага руху і аб тым, што можа адбыцца, калі іх не выконваць. Члены атрада ЮІД пазнаёмілі першакласнікаў з дарожнымі знакамі і расказалі дзецям аб іх значэнні.







21 лістапада лектарская група атрада ЮІД правяла **пяціхвілінку бяспекі** ў першакласнікаў. Падчас мерапрыемства ЮІДаўцы распавялі рабятам пра неабходнасць выканання правілаў дарожнага руху, дысцыплінаваных паводзін на вуліцы і раздалі ім памяткі для пешаходаў.

Першакласнікі прамовілі клятву "Юных пешаходаў" і паабяцалі выконваць правілы дарожнага руху!








# Экскурсія ў Цэнтр бяспекі МНС

29 лістапада вуччні нашай школы наведалі адукацыйны Цэнтр бяспекі МНС. У ходзе экскурсіі рабяты вучыліся правілам бяспекі, праходзілі квэсты, наведалі шмат лакацый, якія мадэлююць надзвычайныя сітуацыі.

Гэта было захапляльнае мерапрыемства. Дзеці ўбачылі, якія могуць быць сітуацыі і да чаго можа прывесці бестурботнасць і невыкананне правіл бяспечных паводзін.

Дзеці абмеркавалі правілы паводзін у цягніку, аўтобусе, на аўтамабілі, пераканаліся ў тым, што рамень бяспекі зберажэ ад падзення. Рабяты таксама здзейснілі віртуальны палёт на самалёце і аварыйную пасадку, скаціліся з паветранага судна па эвакуацыйным трапе. Затым ім прыйшлося перажыць буру, дзе іх практычна знасіла ўраганным ветрам.

Бурныя эмоцыі ва ўсіх прысутных выклікаў трэнажор "Імітацыя землятрусу", а самым захапляльным быў лабірынт па задымленым памяшканні.

Гэта быў добры практычны ўрок для вучняў, дзякуючы якому рабяты зразумелі, наколькі важна выконваць правілы бяспечных паводзін.













# Шосты школьны дзень




**12 лістапада** ў рамках шостага школьнага дня вучні 5-8 класаў прынялі ўдзел у **круглым стале "Умей сказаць "Не!"**.

Дзеці гаварылі аб шкодных і карысных звычках, абмеркавалі, чым адрозніваецца звычка ад залежнасці, прагледзелі і пракаментавалі відэаролікі аб шкодзе курэння, у тым ліку і курэння электронных цыгарэт.

У змадэляваных сітуацыях рабяты вучыліся казаць "Не!" у адказ на прапанову аднагодкаў паспрабаваць алкаголь ці цыгарэты. Падчас мерапрыемства вучні чарговы раз пераканаліся ў важнасці вядзення здаровага ладу жыцця і неабходнасці фарміравання правільных звычак.







**26 лістапада** для вуняў 5-9 класаў прайшоў **круглы стол "Гісторыя маёй сям'і".** Падчас мерапрыемства рабяты пагаварылі аб значэнні сям'і ў жыцці кожнага чалавека, падзяліліся гісторыяй сваёй сям'і, расказалі пра сямейныя традыцыі, паўдзельнічалі ў гульнях і віктарыне. У выніку ўсё прыйшлі да наступных высноваў: мы павінны захоўваць нашы сямейныя каштоўнасці і традыцыі; кожны з нас прадстаўляе сям'ю як ачаг, дзе пануюць Любоў, Вернасць, Памяць і Клопат; неабходна любіць блізкіх людзей і берагчы свае сем'і, працягваць сямейныя традыцыі, каб не разгубіць сямейных каштоўнасцяў!









Галоўны рэдактар – Ярашэвіч Мар'яна, вучаніца 8 класа.
Газета выходзіць 1 раз у месяц на працягу навучальнага года.
Наступны нумар выйдзе 30 снежня.
Тыраж – 15 нумароў. Кошт – 1 руб.